## Вучэбная дысцыпліна «Славянская міфалогія»

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя) спецыяльнасць: 6-05-0232-01 Беларуская філалогія<br>Цыкл спецыяльных дысцыплін: кампанент установы вышэйшай адукацыі<br>Сацыяльна-гуманітарны модуль-2 |
| **Кароткі змест** | Міфалогія як форма светапогляду. Старажытныя формы народных вераванняў. Міфалагічная мадэль свету. Міфы пра стварэнне свету. Асноўныя славянскія міфалагемы. Сонца, месяц, зоркі ў міфалогіі славян. Космас і гісторыя ў міфалогіі славян. Персанажы вышэйшага міфалагічнага ўзроўню. Персанажы ніжэйшага міфалагічнага ўзроўню. Кола чалавечага жыцця. Міфалогія дома і гаспадарчай дзейнасці. Міфалагічныя ўяўленні пра жывёльны свет. Міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з раслінным светам. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен<br>**ведаць**: псіхалагічна-сацыяльныя вытокі міфалогіі, яе раннія формы; касмагонію і касмалогію; міфалагічныя сістэмы індаеўрапейскіх народаў; міфы пра першапродкаў – культурных герояў і ў сувязі з імі – станаўленне літаратурнага эпасу; сувязі міфалогіі і фальклору.<br>**умець:** праводзіць этымалагічны, з улікам ведання міфалогіі, аналіз фактаў мовы, што дае магчымасць больш глыбока і тонка разумець тропіку літаратурных твораў; праводзіць тыпалагічны аналіз міфалагічных сістэм народаў Еўразіі; знаходзіць міфалагічныя вобразы, матывы ў фальклорных і літаратурных творах.<br>**валодаць:** методыкай аналіза міфалагічных адзінак. |
| **Прэрэквізіты** | Дысцыпліны модуля «Гісторыя беларускай літаратуры»; Культуралогія. |
| **Працаёмкасць** | 2 заліковыя адзінкі, 72 акадэмічныя гадзіны, з іх 36 аўдыторных: 20 гадзін лекцыйных, 16 гадзін практычных заняткаў. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 2 семестр, дыфірыенцыраваны залік. |